БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС



Марына СТАНІСЛАВОВІЧ

# ПАЎСТАННЕ 1863—1864 гг. У ПОЛЬШЧЫ, ЛІТВЕ І БЕЛАРУСІ

*IX клас*

9(07)

*Настаўніца прапануе правесці вывучэнне даволі складанай і аб'ёмнай тэмы ў форме ўрока-семінара. На ўроку вучні працуюць у асноўным з вучэбным дапаможнікам, выконваюць заданні і адказваюць на пытанні на картках, якія ім раздае настаўнік.*

**Мэта і задачы ўрока:** паказаць гістарычнае значэнне паўстання; выявіць прычыны, мэты, характар, прычыны паражэння і асноўны склад удзельнікаў паўстання; вызначыць ролю К.Каліноўскага ў развіцці ідэі народнай дзяржавы; удасканальваць уменне працаваць з контурнай картай і дакументамі; прадаўжаць фарміраваць рэфлексіўныя ўменні вучняў; спрыяць фарміраванню патрыятычных і грамадзянскіх якасцей вучняў, іх нацыянальнай свядомасці.

**Тып урока:** вывучэнне новага матэрыялу.

**Форма ўрока:** семінар.

**Забеспячэнне ўрока:** Гісторыя Беларусі, канец XVIII — пачатак XX ст.: вучэб. дапам. для 9 кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / С.В.Марозава, У.А.Сосна, С.В.Паноў; пад рэд. У.А.Сосны. Мн., 2011; Біч М. За мужыцкую праўду // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1988, № 1; Кропоткин П.А. Записки революционера. М., 1990; Каліноўскі К. За нашую вольнасць. Творы. Дакументы. Мн., 1999; карткі з пытаннямі і заданнямі, ліст узаемакантролю.

**Афармленне класнай дошкі:** на дошцы запісаны тэма ўрока, новыя паняцці, план вывучэння тэмы, эпіграф.

Адважна, брацця, наперад ідзіце
Цвёрдай і правай ступою!
Кожнаму смела ў вочы глядзіце,
Праўду нясіце з сабою!
За родну краіну, звычай, і мову,
За веру груддзю ставайце!
Да будзьце верныя сваему слову,
З Богам заўсёды трывайце!

***Карусь Каганец.** "Наша сымболь".*

**Паняцці:** *агульнанацыянальнае паўстанне, ваеннае становішча, "Мужыцкая праўда", народная дзяржава, "Пісьмы з-пад шыбеніцы", "чырвоныя", "белыя".*



*СТАНІСЛАВОВІЧ Марына Іванаўна.*
*Настаўніца гісторыі і грамадазнаўства сярэдняй школы № 3 г. Ганцавічы Брэсцкай вобл. Нарадзілася ў в. Куршынавічы Ляхавіцкага раёна. Працавала ў дзіцячым садзе ў роднай вёсцы. У 2006 г. закончыла гістарычны факультэт Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С.Пушкіна. Займаецца краязнаўствам, выступае ў перыядычным друку з артыкуламі па методыцы выкладання гісторыі. Мае вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю.*



gisdapamoga.bspu.by

**Апераджальнае заданне:** прачытаць дадатковую літаратуру па тэме, а таксама § 15 вучэбнага дапаможніка.

### План урока

I. Арганізацыйны момант.
II. Актуалізацыя ведаў вучняў.
III. Вывучэнне новага матэрыялу.
1. Уступнае слова настаўніка.
2. Тлумачэнне спосабаў вывучэння тэмы.
3. Вывучэнне новай тэмы: а) прычыны, перадумовы і падрыхтоўка паўстання; б) Кастусь Каліноўскі. "Мужыцкая праўда"; в) пачатак і ход паўстання; г) падаўленне паўстання і прычыны яго паражэння.
IV. Замацаванне новага матэрыялу.
V. Падвядзенне вынікаў урока.

### Ход урока

**I. Арганізацыйны момант.**

Настаўнік называе тэму ўрока, знаёміць вучняў з яго планам, разам з імі вызначае яго мэту і задачы.

**II. Актуалізацыя ведаў вучняў.**

*Настаўнік.* Перш чым прыступіць да разгляду новага матэрыялу, вам неабходна адказаць на пытанне, якое запісана на дошцы. *Якімі былі мэты і склад паўстанцаў 1830—1831 гг.?*

**III. Вывучэнне новага матэрыялу.**

***1. Уступнае слова настаўніка.***

*Настаўнік.* У шматнацыянальных заходніх губернях Расійскай імперыі ў першай палове XIX ст. вострым заставалася так званае польскае пытанне — імкненне рэвалюцыйнай шляхты аднавіць польскую дзяржаву ў межах былой Рэчы Паспалітай. З часоў падзелу Рэчы Паспалітай польскі патрыятычны рух не даваў спакою расійскім уладам, якія то бізуном, то пернікам спрабавалі супакоіць палякаў.

Польскі патрыятычны лагер падзяліўся на *дэмакратаў*, якія выступалі за паўстанне, і *лібералаў* — прыхільнікаў мірных сродкаў барацьбы. Да падрыхтоўкі ўзброенага паўстання на тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай прыступілі ў 1862 г. Вясной у Варшаве быў створаны Цэнтральны нацыянальны камітэт (ЦНК), а ўлетку таго ж года для падрыхтоўкі паўстання ў Беларусі і Літве ў Вільні арганізаваны Літоўскі правінцыяльны камітэт (ЛПК), які падпарадкоўваўся ЦНК.

Кіраўніцтва ўзброеным паўстаннем у Беларусі і ў Літве ўзначаліў Літоўскі правінцыяльны камітэт на чале з **Кастусём Каліноўскім.**

Тыя, хто добра ведаў Кастуся Каліноўскага, параўноўвалі яго з вядомымі дзеячамі Вялікай французскай рэвалюцыі Жанам Полем Маратам і Максіміленам Рабесп’ерам. Яны не былі далёкія ад ісціны, бо падобныя людзі акумулююць у сабе самае лепшае, што характэрна для ідэальнага чалавека, шмат робяць для таго, каб і ўсе людзі станавіліся лепшымі.

Сучаснікі **К.Каліноўскага** пакінулі самыя высокія ацэнкі пра яго: "*Гэтага чалавека нельга было ні напалохаць, ні збіць з панталыку*", "*Гэты чалавек адзін каштаваў сотняў*".

Пра жыццё і дзейнасць Кастуся Каліноўскага выдадзена навуковая і навукова-папулярная літаратура на дзесяці мовах. У мастацкай літаратуры яму прысвечаны такія выдатныя творы, як верш Петруся Броўкі "Кастусь Каліноўскі", паэмы Аркадзя Куляшова "Хамуціус", Максіма Танка "Каліноўскі", раман Уладзіміра Караткевіча "Каласы пад сярпом тваім" і героіка-рамантычная драма "Кастусь Каліноўскі". Яго вобраз увасоблены на дзясятках мастацкіх палотнаў. Памяць пра патрыёта сваёй Радзімы Кастуся Каліноўскага захавалася ў беларусаў. У г.п. Свіслач Гродзенскай вобласці ёсць помнік Кастусю Каліноўскаму. Яго імем названы вуліцы ў Мінску і іншых гарадах рэспублікі.

Сёння мы павінны высветліць прычыны, мэты, характар і гістарычнае значэнне паўстання 1863—1864 гг. у Польшчы, Літве і Беларусі.

***2. Тлумачэнне спосабаў вывучэння тэмы.***

Настаўнік падзяляе клас на групы і падгрупы і адзначае, што яны будуць працаваць самастойна з вучэбным дапаможнікам і выконваць заданні, запісаныя на картках.

Вучні класа размяркоўваюцца на дзве вялікія групы: практычную, або вучэбную *(варыянт I)* і творчую *(варыянт II)*. Група першага варыянта падзяляецца на 4 падгрупы. У кожнай падгрупе павінна быць не менш за два вучні. Пасля падрыхтоўкі адзін вучань будзе адказваць, а другі дапаўняць яго. Вучні творчай групы, у якой можа быць некалькі чалавек (іх колькасць вызначае настаўнік), самі выбіраюць картку з заданнямі.

Для вучняў, якія працуюць з карткамі варыянта I, указваецца месца працы — стол і класная дошка для адказаў.

Рабочае месца для першай групы — стол.

Рабочае месца для другой групы — стол і левая частка класнай дошкі.

Рабочае месца для трэцяй групы — стол і цэнтральная частка класнай дошкі.

Рабочае месца для чацвёртай групы — стол і правая частка класнай дошкі.

Пасля выканання заданняў заслухоўваюцца адказы вучняў.

Вучні, якія працуюць каля класнай дошкі, паведамляюць настаўніку аб заканчэнні работы і выступаюць са сваімі адказамі. Вучні, якія сядзяць за сталамі, уважліва слухаюць адказы на пытанні і заданні і потым задаюць прамоўцу пытанні.



gisdapamoga.bspu.by

Калі прамоўца не адказаў на некаторыя пытанні, яго папраўляе і дапаўняе другі вучань той жа падгрупы. Калі на дошцы заўважаны памылкі, яны выпраўляюцца крэйдай іншага колеру.

Вучні, якія засталіся не ахопленыя праверкай ведаў па першым варыянце, рыхтуюцца да адказу на пытанні сваіх картак па другім варыянце.

***3. Вывучэнне новай тэмы.***

**Варыянт I**

***Картка № 1***

Выканайце *заданні* і адкажыце на *пытанні*:

*Заданні:*

1. Вызначыце прычыны і характар паўстання.
2. Прадстаўце наступную інфармацыю пра К.Каліноўскага: гады жыцця, месца нараджэння, паходжанне, месца вучобы.

*Пытанні:*

1. Якую пасаду займаў К.Каліноўскі ў Літоўскім правінцыяльным камітэце?
2. Дзе знаходзіўся Літоўскі правінцыяльны камітэт?

***Картка № 2***

Выканайце *заданні* і адкажыце на *пытанні*:

*Заданне:*

Вызначыце погляды К.Каліноўскага на:

а) форму барацьбы паўстанцаў;

б) пытанне аб зямлі;

в) пытанне аб дзяржаўнасці Літвы і Беларусі;

г) пытанне аб аднаўленні Рэчы Паспалітай у межах 1772 г.

*Пытанні:*

1. Калі выйшаў першы нумар газеты "Мужыцкая праўда"?
2. Хто ўдзельнічаў у яе выданні?
3. Да каго звярталіся выдаўцы газеты?
4. На якой мове яна выдавалася?
5. Якім псеўданімам падпісваў К.Каліноўскі "Мужыцкую праўду"?
6. Колькі нумароў газеты выйшла?

***Картка № 3***

На класнай дошцы выканайце *заданні*:

1. Запішыце даты:

а) пачатку паўстання ў Польшчы;

б) пачатку паўстання ў Літве і ў Беларусі;

в) канчатковага падаўлення паўстання.

2. Аформіце табліцу "Асноўныя палітычныя групоўкі ў паўстанні 1863—1864 гг." (заданне 1 на с. 84 вучэбнага дапаможніка).
3. Пазначце, дзе адбылася самая буйная бітва на тэрыторыі Беларусі пад кіраўніцтвам К.Каліноўскага.
4. Пералічыце, якія сацыяльныя слаі грамадства ўдзельнічалі ў паўстанні.

***Картка № 4***

Выканайце *заданні* і адкажыце на *пытанні*:

1. Якія дзеянні прадпрымаў М.М.Мураўёў супраць паўстанцаў?
2. Назавіце прычыны паражэння паўстання.
3. Запішыце, калі і дзе адбылося пакаранне К.Каліноўскага.
4. Якімі былі яго апошнія словы?
5. Як сучаснікі шануюць памяць пра К.Каліноўскага?

**Варыянт II**

***Картка № 1***

*Заданні:*

1. Адзначце на контурнай карце губерні, у якіх найбольш актыўна развівалася паўстанне; месца, дзе адбылася самая буйная бітва паўстанцаў пад кіраўніцтвам К.Каліноўскага на тэрыторыі Беларусі.
2. Прачытайце дакумент і адкажыце на пытанні: Што, на думку вядомага расійскага дзеяча рэвалюцыйнага руху П.Крапоткіна, стала паваротным пунктам у паўстанні 1863—1864 гг.? Чаму сяляне перайшлі на бок расійскіх войскаў і пачалі ім дапамагаць? У чым П.Крапоткін бачыць галоўную памылку кіраўнікоў паўстання?

**Успаміны П.А.Крапоткіна аб прычынах паражэння паўстання 1863—1864 гг.:**

*"Когда Михаила Муравьёва посылали в Литву, и он пришёл проститься с императрицей Марией Александровной, она сказала ему:*

*— Спасите хоть Литву!*

*Польша считалась уже утерянной.*

*Вооружённые банды повстанцев держали весь край, — рассказывал мой двоюродный брат. — Мы не могли не только разбить, но и найти их. Банды нападали беспрестанно на наши небольшие отряды; а так как повстанцы сражались превосходно, отлично знали местность и находили поддержку в населении, то они оставались победителями в таких случаях. Поэтому мы вынуждены были ходить всегда большими колоннами. И вот мы ходили всё время по всему краю, взад и вперёд, среди лесов, а конца восстанию не предвиделось. Пока мы пересекали какую-нибудь местность, мы не встречали никакого следа повстанцев. Но как только мы возвращались, то узнавали, что банды опять появились в тылу и собирали патриотическую подать. И если какой-нибудь крестьянин оказал услуги нашим войскам, мы находили его повешенным повстанцами. Так дело тянулось несколько месяцев, без всякой надежды на скорый конец, покуда не прибыли Милютин и Черкасский. Как только они освободили крестьян и дали им землю, всё сразу изменилось. Крестьяне перешли на нашу сторону и стали помогать нам ловить повстанцев. Революция кончилась.*

*В Сибири я часто беседовал с ссыльными поляками на эту тему, и некоторые из них понимали*



gisdapamoga.bspu.by

*ошибку, которая была сделана. Революция с самого начала должна явиться актом справедливости по отношению к "униженным и оскорблённым", а не обещанием поправки зла в будущем; иначе она наверное не удастся. К несчастью, часто случается, что вожди бывают поглощены вопросами политики и военной тактики, что забывают самое главное. Между тем революционеры, которым не удаётся убедить массу, что для неё начинается новая эра, готовят верную гибель своему собственному делу. (Кропоткин П.А. Записки революционера. М., 1990. С. 168.)*

***Картка № 2***

Адкажыце на *пытанні*:

1. Якую з'яву адлюстроўвае выказванне беларускага селяніна ў сувязі з пераглядам умоў сялянскай рэформы ў 1863 г.: "*Дзякуем Вам, паночку, і ўсяму панству, что Вы ўзбунтаваліся. Інакш бы нам такой ласкі ад цара вавек не дачакацца*".

2. У чым заключалася праблема, якую закрануў К.Каліноўскі ў "Мужыцкай праўдзе", і прапанаваны ім шлях яе вырашэння: "*Калі Бог стварыў усіх людзей вольнымі ... так скуль жа гэта ўзялося, што адзін марнуе і над людзьмі збыткуе, а другі, бедны, паншчыну служыць альбо аброкі ў казну плаціць?... Мужыкі .... не павінны плаціць ані чыншу панам, ані аброку ў казну за зямлю. Бо гэта зямля да нас належыць...*".

***Картка № 3***

Уявіце сябе ўдзельнікам паўстання пад кіраўніцтвам К.Каліноўскага. Ад якіх дзеянняў вы асабіста маглі б перасцерагчы паўстанцаў і якую б праграму вы б прапанавалі.

**IV. Замацаванне новага матэрыялу.**

Яго варта правесці па пытаннях і заданнях 2—5 па § 15 (на с. 85) шляхам франтальнай гутаркі з вучнямі.

Пры наяўнасці часу можна прапанаваць праверку ведаў па наступных заданнях.

Выберыце правільны варыянт адказу.

1. Мянушка, якой карыстаўся К.Каліноўскі, калі выдаваў газету "Мужыцкая праўда": а) Мацей Бурачок; б) Янка Лучына; в) Яська-гаспадар з-пад Вільні.

2. Першай рэвалюцыйна-дэмакратычнай газетай у Беларусі, якая выдавалася на беларускай мове, была: а) "Газета Гродзенская"; б) "Мужыцкая праўда"; в) "Минский листок".

3. Мэтай "белай" плыні ў паўстанні 1863—1864 гг. было: а) ліквідацыя памешчыцкага землеўладання; б) набыццё Беларуссю дзяржаўнай самастойнасці; в) аднаўленне Рэчы Паспалітай у межах 1772 г.

4. "Чырвоная" плынь у паўстанні 1863—1864 гг. на чале з К.Каліноўскім выступала за: а) ліквідацыю памешчыцкага землеўладання; б) далучэнне Беларусі да адноўленай Польшчы; в) аднаўленне Рэчы Паспалітай у межах 1772 г.

5. Дайце азначэнне наступных тэрмінаў: *радыкальная плынь, кансерватыўная плынь, "белыя", "чырвоныя"*.

6. Правільна суаднясіце імёны гістарычных дзеячаў і іх характарыстыку:

1. А.Герцан;
2. К.Каліноўскі;
3. М.Мураўёў;
4. В.Урублеўскі.

а) адзін з арганізатараў выдання "Мужыцкай праўды";
б) віленскі генерал-губернатар;
в) рускі рэвалюцыянер-дэмакрат;
г) старшыня ЛПК.

7. Сярод пералічаных назваў вызначыце тыя, якія маюць дачыненне да жыцця і дзейнасці К.Каліноўскага: Цэнтральны нацыянальны камітэт, Свіслацкая прагімназія, Літоўскі правінцыяльны камітэт, Польскі нацыянальны ўрад, часопіс "Гоман", газета "Мужыцкая праўда", "Пісьмы з-пад шыбеніцы".

8. Знайдзіце і выпраўце памылкі ў тэксце:

Апынуўшыся пасля заканчэння Маскоўскага ўніверсітэта на радзіме, К.Каліноўскі ўзначаліў Літоўскі правінцыяльны камітэт у Гродне. Будучы кіраўніком паўстання ў Польшчы, ён жадаў далучыць да яе літоўска-беларускія губерні. Згодна прыгавору ваеннага суда, быў расстраляны ў Вільні.

9. Вызначыце правільную паслядоўнасць падзей: а) пачатак выдання "Мужыцкай праўды"; б) кіраўніцтва К.Каліноўскім ЛПК; в) канчатковае падаўленне паўстання ў Беларусі; г) пачатак паўстання ў Польшчы; д) адмена прыгоннага права.

**V. Падвядзенне вынікаў урока.**

*Самаацэнка* праводзіцца вучнямі па атрыманай анкеце.

*Дамашняе заданне* не задаецца.

**Літаратура па тэме:**

Барыс С. Сістэма кіравання паўстаннем 1863—1864 гг. у Літве і Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. 2003, № 7. С. 21—29.

Біч М. Нацыянальнае і аграрнае пытанні ў час паўстання 1863—1864 гг. // Беларускі гістарычны часопіс. 1993, № 3. С. 36—45.

Зайкоўскі Э. Памятныя мясціны 1863 года // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1988, № 1.

Казбярук У. Прадвесне беларускага нацыянальнага Адраджэння // Роднае слова. 1993, № 8.

Кісялёў Г. Сейбіты вечнага. Мн., 1963.

Шалькевич В. Кастусь Калиновский. Страницы биографии. Мн., 1988.



gisdapamoga.bspu.by